***А. А. Караткевіч***

*Навуковы кіраўнік*
***К. Р. Федарцова***

*Беларускі гандлёва-эканамічны*
*ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# СТАНОЎЧЫЯ І АДМОЎНЫЯ БАКІ ДРУКАВАНАЙ І ЭЛЕКТРОННАЙ КНІГ

Нярэдка можна пачуць развагі пра тое, што ў хуткім часе электронныя кнігі практычна цалкам выцесняць традыцыйныя папяровыя. Аднак, калі адкінуць эмоцыі і падысці да разгляду гэтага пытання больш узважана, стане відавочна, што чуткі пра хуткую адмену папяровых кніг моцна перавялічаны.

Мэта нашага даследавання – высвятленне супрацьстаяння традыцыйных (папяровых) і электронных кніг на аснове аналізу праведзенага анкетавання сярод студэнтаў установы адукацыі «Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі».

Анкетаванне складалася з двух пытанняў: 1) на вашу думку, якая кніга лепш: друкаваная або электронная?; 2) адзначце станоўчыя і адмоўныя бакі друкаванай і электроннай кніг. У анкетаванні прыняло ўдзел 88 студэнтаў трох факультэтаў дзённай формы атрымання адукацыі. З іх 59 аддало сваю перавагу друкаванай кнізе, 20 галасоў аддадзена электроннай кнізе, 9 чалавек не змаглі адназначна адказаць, бо імі выбіраўся фармат кнігі ў залежнасці ад абставін.

Прывядзём найбольш папулярныя *станоўчыя каментарыі друкаванай кнігі*: 1) прыемна трымаць у руках, гартаць кожную старонку; 2) зачароўвае пах новых старонак; 3) электронныя кнігі псуюць зрок.

Часцей згаданымі *адмоўнымі бакамі друкаванай кнігі* студэнтамі адзначаліся: 1) друкаваныя кнігі шмат каштуюць; 2) можна парваць старонкі; 3) раздражняе пах кніг.

Вартыя ўвагі думкі асобных апытаных наконт папяровых кніг. Спынімся на тых адказах, якія нам найбольш спадабаліся:

- Пошук добрай кнігі, паход у бібліятэку – гэта своеасаблівы рытуал.
- Кнігі, якія выдадзеныя даўно, пры гартанні наводзяць на думкі пра тое, дзе яны друкаваліся.
- Падабаецца, як з кожнай старонкай бачыш, колькі яшчэ засталося чытаць.
- Часам хочацца забыцца пра ўсе сучасныя гаджэты і атрымаць асалоду ад моманту, праведзенага разам з кнігай у руках.
- Папяровыя кнігі зрок не псуюць, але могуць выклікаць алергію.
- Друкаваныя кнігі не настолькі шматфункцыянальныя, як электронныя.
- У папяровай кнізе можа быць дробны шрыфт, а ў электроннай ёсць магчымасць наладзіць любы памер шрыфта.

Цікавыя думкі наконт асаблівага паху кніг: “Пах свежанадрукаванай кнігі – адзін з лепшых пахаў у свеце”, “Калі б выпусцілі духі з пахам кніг, я б абавязкова купіла”.

Часцей за ўсё студэнтамі адзначаліся наступныя *станоўчыя бакі электроннай кнігі*: 1) друкаваную кнігу трэба дзесьці шукаць, куды-небудзь ісці, электронную можна спампаваць і дома; 2) электронную кнігу можна ўзяць куды заўгодна; 3) зручней і больш даступная.

Найбольш папулярныя *адмоўныя каментарыі электроннай кнігі*: 1) электронная кніга можа пазбавіцца зараду, а па блізкасці не будзе зараднага прыстасавання; 2) чытанне электроннай кнігі робіць успрыманне інфармацыі цяжэй; 3) электронныя кнігі рассейваюць увагу, а папяровыя не.

Безумоўна, мы жывём у эру лічбавых тэхналогій, але друкаваная кніга ўсё гэтак жа не страчвае сваёй актуальнасці, што даказвае аналіз анкетавання моладзі, паколькі большасць апытаных аддалі перавагу менавіта гэтай кнізе.

На нашу думку, і той і іншы фармат маюць права на існаванне. Адзін фармат дапаўняе іншы. У некаторых выпадках зручней карыстацца папяровымі кнігамі, у іншых – электроннымі. Лічым, што ў будучыні захаваюцца абодва фарматы, радуючы чытачоў магчымасцю выбіраць той, які падыходзіць лепш для іх канкрэтнай сітуацыі.